**Сяргей Дубавец**

# Прадмова

## Практыкаваньне № 1

З усяго ўласнага досьведу выхаваньня вылучу адзін стары, але цалкам рабочы прынцып: ад самага нараджэньня дзіцяці кожны чалавек у ягоным атачэньні мусіць быць носьбітам пэўнай мовы. Нашы дзеці гадуюцца ў блытаным моўным сьвеце, але мы самі здольныя зрабіць гэты сьвет для іх больш спарадкаваным і зразумелым.

Першай моваю, якую маё дзіця пачула ад зачацьця, была беларуская — так і толькі так заўсёды гаварылі мы з жонкай. Пасьля нараджэньня да нас далучыліся дзяды гарадзкія (толькі расейская) і дзяды вясковыя (трасянка). Гэтак дзіця вучылася гаварыць паралельна на дзьвюх мовах, выразна адрозьніваючы адну ад адной. Далей далучыўся літоўскі дзіцячы садок, дзе зь першых дзён размаўлялі толькі па-літоўску. Школа была беларуская віленская, а двор — віленскі літоўскі. У выніку сёньня ў свае 17 гадоў дзіця амаль дасканала гаворыць і піша і па-беларуску, і па-расейску, і па-літоўску.

Ня маю сумневу, што вынік мог быць і большы. Калі б, скажам, бацька гаварыў зь дзіцём толькі (!) па-беларуску, маці — толькі па-ангельску, бабуля — толькі па-японску, дзядуля — толькі на суагілі... Дзіця вырасла б праўдзівым паліглётам, але пры тым — зусім нармальным чалавекам са здароваю псыхікай.

Мой уласны прыклад выхаваньня — адваротны. У псэўдарасейскамоўнай менскай сытуацыі даводзілася разоў пяць ці нават дзесяць брацца за ангельскую — кожнага разу з розным імпэтам і ад пачатку (школа, унівэрсытэт, усялякія курсы). Аднак, трапляючы ў Англію ці Амэрыку, я пераконваўся, што вывучаў нешта зусім іншае ад той мовы, на якой там гавораць людзі. У даведцы лёнданскага аэрапорту ў мяне не зразумелі, што такое “мэтро”, бо яно там называецца “андэграўндам”, а ў першым лёнданскім бары я не знайшоў “тойлету”, які там называецца “лэвэтэры” (у Штатах, дарэчы, — “рэструм”) — слова, якое ў мяне асацыявалася хутчэй зь бібліятэкай — “лайбрэры”. Такіх прыкладаў — сотні, але мой асабісты досьвед засваеньня моваў, на жаль, — тыповы для нашых краёў.

Маё дзіця ня стала паліглётам. Яму цяжкавата даецца што ангельская, што японская, што польская, што лаціна. Аднак тры мовы, засвоеныя ў маленстве, як той казаў, адлятаюць ад зубоў. Гэткі прынцып быў вычуты намі з жонкай ці то ў паветры, ці то ў нашай нацыянальнай сьведамасьці, а мо навеяны літаратурай XIX стагодзьдзя, калі дзіцяці наймалі гувэрнантку-францужанку і настаўніка-немца. Так ці інакш, але гэткае няхітрае практыкаваньне даступнае любой беларускай сям’і і дазваляе кожнаму дзіцяці, незалежна ад здольнасьцяў, палегчыць ягонае наступнае жыцьцё.